# Пачытаем віртуальна!

Зацікаўленая размова пра інавацыйныя працэсы як фактар развіцця сучаснай бібліятэкі ішла падчас абласнога семінара, які праводзіўся ў Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобласці.

Яшчэ гадоў дзесяць таму ў бібліятэках толькі пачыналася ўкараненне сучасных камп'ютарных тэхналогій, а сёння чытача ўжо не здзівіш доступам у інтэрнэт. У кніжніцу цяпер прыходзяць для таго, каб атрымаць самую розную інфармацыю. Задача бібліятэкара — дапамагчы наведвальніку, прычым у самыя кароткія тэрміны.

Як адзначыла загадчыца навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Марына Пшыбытка, сёння супрацоўнікі бібліятэчных сістэм працуюць над павелічэннем тэмпаў інфарматызацыі, развіццём карпаратыўнага ўзаемадзеяння ўстаноў па набыцці, стварэнні і выкарыстанні электронных інфармацыйных рэсурсаў, фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў і іх захаванне. Гэтыя задачы сфармуляваны ў дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011 — 2015 гады, мэта якой — забеспячэнне вольнага доступу да інфармацыйных рэсурсаў для ўсіх жыхароў краіны.

Для павелічэння тэмпаў інфарматызацыі дзяржпраграмай прадугледжана аснашчэнне бібліятэк новымі камп'ютарамі і серверным абсталяваннем. Чакаецца, што да канца 2015 года на 1000 адзінак насельніцтва будзе прыходзіцца не менш як адно аўтаматызаванае працоўнае месца з камп'ютарам і доступам у інтэрнэт. Самых вялікіх поспехаў у інфарматызацыі бібліятэк дамагліся ў Гродзенскай вобласці.

А як папаўняюцца бібліятэчныя фонды? Сучасная моладзь больш сарыентавана на электронныя дакументы. Таму дзяржпраграма развіцця бібліятэк прадугледжвае набыццё электронных выданняў і баз дадзеных. На жаль, не кожная кніжніца можа іх сабе дазволіць. Рашэнне праблемы прапанавала Нацыянальная бібліятэка, якая адкрыла віртуальную чытальную залу і запрасіла астатнія бібліятэкі стаць партнёрамі, набываць неабходныя дакументы карпаратыўна.

На Гродзеншчыне супрацоўнікі бібліятэк не баяцца эксперыментаваць з новымі формамі. Нават разглядаецца магчымасць адкрыцця ў некаторых установах дзіцячых пакояў для самых маленькіх наведвальнікаў. Хаця спярша трэба вырашыць шмат арганізацыйных пытанняў. Пра працу з самымі юнымі чытачамі распавяла загадчыца Ваўкавыскай раённай дзіцячай бібліятэкай Маргарыта Нікіфарава. Яна і яе калегі добра ведаюць, як навучыць дзіця любіць кнігу.

Па заказе Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама ў Выдавецкім доме «Звязда» хутка ўбачыць свет багата ілюстраванае выданне «Культура Гродзеншчыны: Факты. Падзеі. Асобы», якое распавядае пра гістарычную, культурную і духоўную спадчыну гэтага самабытнага рэгіёна. У многія бібліятэкі вобласці паступілі кнігі з серыі «Сугучча сэрцаў». «Гэта ўнікальны кніжны праект, які ўпершыню рэалізуецца ў Саюзе Незалежных дзяржаў і спрыяе ўмацаванню літаратурных сувязей паміж краінамі СНД, — зазначыла намеснік дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Ала Корбут. — Маладым чытачам цікава будзе пазнаёміцца з творчасцю такіх майстроў слова, як Алена Брава, Дзмітрый Саўчык, Вольга Тарасевіч, Ірына Фамянкова.

**Раіса МАРЧУК**